# МОЦНЫЯ ДУХАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Стрэлку гадзінніка адматалі назад успаміны аднаго з падпольшчыкаў, знойдзеныя ў Нацыянальным архіве Беларусі. Аказваецца, Георгій Сапун, якому проста цудам удалося пазбегнуць расправы, утрымліваўся ў адной камеры з Вячаславам Нікіфаравым!

Георгія Паўлавіча сярод нас ужо даўно няма. Затое жывуць і яшчэ доўга будуць жыць яго ўспаміны. Перачытваючы напісаныя пасля вайны аркушы, разумееш, што гадзіны, праведзеныя ў турме, той памятаў да дробязяў. Не дзіва! Кожнае імгненне для падпольшчыкаў магло быць апошнім... Я лаўлю знаёмыя мне прозвішчы — Кавалёў, Караткевіч, Хмялеўскі, Герасіменка, Шугаеў, Нікіфараў, — і тыя жудасныя падзеі паўстаюць перад вачамі.

## ТРАСЦЯНЕЦ ПАЧАКАЕ

«Аглядаю ўсіх і раблю вывад, што настрой амаль ва ўсіх бадзёры, ні цені страху або адчаю, — піша Георгій Сапун. — Адзін толькі Шугаеў стаяў, апусціўшы вочы, і выгляд у яго быў прыгнечаны — ён быў хворы».



Цяпер на месцы хаты Таццяны Якавенкі, дзе ў пакоі Арсенія Грышына стваралася газета, стаіць помнік.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

...З СД падпольшчыкаў выводзілі пад узмоцненым канвоем. Загнаўшы ў чорную крытую машыну, якую зняволеныя называлі «воранам», за імі зачынілі дзверы. Вязні былі перакананыя — іх чакае Трасцянец. Але нягледзячы на тое, што машына рухалася хутка, па яе манеўрах падпольшчыкі здагадаліся: вязуць іх у напрамку турмы.

«Калі адчынілі дзверы і высадзілі нас з машыны, мы сапраўды апынуліся на ўжо знаёмым мне турэмным двары, — успамінае Сапун. — Зноў пастроілі нас тварам да сцяны, пачалі абшукваць і праводзіць рэгістрацыю. Вобыск быў пільны і здавалася, што можна было шукаць у нас, ужо некалькі разоў абшукваемых дагэтуль? Але прагледзелі ўсё, што толькі можна было, — адабралі нават падвязкі, агрызкі алоўкаў, шматкі паперы, дробку тытуню, у некаторых зрэзалі гузікі».

Семярых іх памясцілі ў падвальную камеру пад нумарам 10. Камера была пустая: толькі мураваная падлога і такія ж сцены. Шкло ў адзіным маленькім акне было выбіта. Адсюль — жудасны холад. Сцены і падлога настолькі астывалі, што сесці на апошнюю або нават падперціся да сцяны не ўяўлялася магчымым. Сітуацыю ўскладняла тое, што ўсе былі апрануты па-летняму. У некаторых адсутнічала ніжняя бялізна: яна папросту згніла ад незагоеных ран...

## БАРАЦЬБА З ХОЛАДАМ

Яны сустрэліся ў адной камеры пасля некалькіх месяцаў допытаў у СД. Ужо нават і не спадзяваліся ўбачыць кагосьці жывым. Таварышам хацелася, не адкладаючы на потым, пагаварыць, распытаць пра многае. Усе глядзелі адзін на аднаго і, напэўна, думалі: хто гэта той, з-за каго прывялі іх усіх сюды са звязанымі рукамі?

Пакуль, успамінаючы падрабязнасці таго жудаснага дня, яны рабілі першыя высновы, холад незаўважна скоўваў іх рухі. Каб хоць крыху сагрэцца, пачалі хадзіць па камеры. Адзін Коля Шугаеў, звярнуўшыся клубочкам, сядзеў на мураванай падлозе ў куце.

«Камера была малая, і ў цемры пры хаджэнні штурхалі адзін аднаго, — расказвае Георгій Сапун. — Праз гадзіну-паўтары ўсе стаміліся, а цяплей не станавілася. Стала зразумела, што не хопіць сіл пратрымацца ўсю ноч на нагах. Вырашылі ўсёй групай размясціцца каля дзвярэй, прыціснуцца шчыльней і грэц адзін аднаго ўласнымі целамі. У гэты час, калі пачалі размяшчацца, пачулася лязганне калідорных краціістых дзвярэй, і кагосьці падвялі да нашай камеры».

Гэтымі «навічкамі» былі падпольшчыкі Івашчонак, Цвяткоў і Грышын — той самы, у чыім пакоі ў хаце Таццяны Якавенкі, што па Выдавецкай вуліцы, друкаваліся 2-і і 3-і нумары падпольнай «Звязды». Амаль апошнімі з гестапаўскага падвала іх траіх, а таксама яшчэ некалькі чалавек у крытай «душагубцы» везлі ў Трасцянец. Падпольшчыкі ўжо рыхтаваліся да смерці, але, прастаяўшы там доўгі час і памарозіўшы іх, машына павярнула назад, і ўсе яны апынуліся ў турме.

«Карыстаючыся прысутнасцю траіх ахоўнікаў, якія суправаджалі зняволеных, Хмялеўскі і Кавалёў заявілі, што ў камеры жудасны холад, — успамінае падпольшчык. — Адзін з ахоўнікаў з польскім акцэнтам адказаў: «Час цяпер позні, начальства няма, а вас да раніцы чорт не возьме, а заўтра ўсё роўна ўсіх павесяць».

## МАЛЕНЬКАЯ ПЕРАМОГА

На досвітку з ахоўнікамі прыйшоў перакладчык — і падпольшчыкаў перавялі ў камеру нумар 13. Памерам яна была значна меншая, чым папярэдняя. Выбітыя вокны — залеплены кардонам і заткнуты бруднымі анучамі. Праўда, стаяў ложак, на якім ляжалі дзве вузенькія дошчачкі. І гэта на дзесяць зняволеных!

«Карыстаючыся сваёй маленькай перамогай, мы пачалі патрабаваць, каб нам далі хоць бы яшчэ некалькі дошак, — піша ў сваіх успамінах вязень. — Перакладчык адправіў ахоўнікаў паглядзець, дзе яшчэ ёсць дошкі, і прынесці нам. Пры гэтым сказаў: «Хто іх ведае, можа, хтосьці і застанецца жывы?»

Яшчэ тры дошкі, прынесеныя ахоўнікамі, падпольшчыкі паклалі каля сцяны. Усё ж сядзець на іх было больш прыемна, чым на голай мураванай падлозе!

...Ішоў першы дзень Каляд. Усё турэмнае начальства святкавала. Зняволеных ніхто не турбаваў. Гэты дзень падпольшчыкі прысвяцілі найбольш злабадзённаму для іх пытанню — хто мог іх выдаць?

«Пачаліся кароткія ўспаміны былых асноўных кіраўнікоў арганізацыі, — расказвае Георгій Сапун. — Высветлілася, што першымі (у адну ноч) былі арыштаваны Кавалёў, Шугаеў, Сержановіч, Нікіфараў і шэраг іншых таварышаў. Аднак калі тыя былі прыведзены ў СД, то там ужо сустрэлі Коціка (Коцікава. — **Аўт.**)».

Шукаючы здрадніка, вязні сышліся ў адным: сапраўды, Коцікаў мог выдаць многіх, але падазрэнне ад яго адводзіў той факт, што ён не ведаў усіх членаў Мінскага падполля.

## УЦЁКІ! ІНШАГА ВЫЙСЦЯ НЯМА

Першыя два дні знаходжання ў 13-й камеры падпольшчыкаў ніхто не турбаваў. А 10—11-й гадзіне раніцы яны звычайна атрымлівалі свой сутачны рацыён: па 80—100 грамаў хлеба, які гатаваўся з вотруб'я гнілога бурака, і паўлітра баланды. Астатні час прысвячаўся ўспамінам і ўдакладненню, хто яшчэ арыштаваны, а хто мог уцалець і выратавацца ад лап гітлераўцаў.


Хата па Выдавецкай вуліцы, дзе пры непасрэдным удзеле Ваціка, як называлі Нікіфарава падпольшчыкі, былі надрукаваны 2-і і 3-і нумары падпольнай «Звязды».

«Вечарам у Кавалёва саспеў план уцёкаў, — піша Сапун. — Ён пераконваў усіх, што іншага выйсця няма. Калі нават нас усіх не расстраляюць або не перавешаюць, то праз месяц-два мы, напэўна, перадохнем з голаду. Ён лічыў, калі з дзесяці чалавек дзевяць загінуць, а адзін зможа ўцячы, то і тады варта бегчы».

План Кавалёва быў няхітры. Ён прапаноўваў, каб хтосьці з вязняў папрасіў у ахоўніка схадзіць па ваду. І калі дзверы камеры адчыняцца, некалькі чалавек павінны былі напасці на ахоўніка, забіць і, захапіўшы яго зброю, бегчы напралом...

Такі план падпольшчыкі не адобрылі. Але Кавалёў не супакойваўся. Ён уважліва агледзеў рашотку акна і, пераканаўшыся ў яе надзейнасці, сказаў, што дастаткова было б выдаліць дзве штангі — і можна пралазіць. Толькі і тут нічога не атрымалася.

## ПРОЗВІШЧЫ НА ДОШЦЫ

Дзякуючы Георгію Сапуну, якому ўдалося выйсці на сувязь са сваёй жонкай, палавіне зняволеных сталі прыносіць перадачы. Хлопцы марылі аб дробцы тытуню, але перадаваць яго вязням катэгарычна забаранялася. Праўда, за асобую плату рабіліся выключэнні. Але якімі сціплымі ні былі б тыя перадачы, ахоўнікі сістэматычна абкрадалі зняволеных.

Аднойчы Караткевічу перадалі запіску, у якой прасілі паведаміць, хто з ім сядзіць. Гэта была правакацыя. «Праклятыя гады, не змаглі даведацца здзекамі і катаваннямі, дык хочуць прымусіць хітрасцю. Не выйдзе!» — сказаў Вячаслаў Нікіфараў.

«Гадзін у 11 дня назвалі Кавалёва і Нікіфарава і павялі, — расказвае Георгій Сапун. — Цэлы дзень прайшоў у напружаным чаканні іх вяртання. Кожны шоргат або стук у калідоры прыкоўваў нашы погляды да дзвярэй камеры... Кожны з нас ведаў, чым звычайна заканчваецца выклік на допыт у гестапа: страшнымі, бесчалавечнымі, зверскімі катаваннямі дзікіх і п'яных вандалаў і садыстаў».

Прайшоў дзень, а яны ўсё не вярталіся. Некаторых яшчэ не пакідала надзея: можа, ноччу? Настала раніца, прайшоў дзень, зноў ноч, а Кавалёў з Нікіфаравым так і не з'явіліся...

«Усе былі ўпэўнены, што з імі пакончылі, — успамінае падпольшчык. — Блізкая смерць лунала над усімі. Усе казалі пра смерць, як пра нешта звычайнае. Ні ў кога не з'явілася нават невялікага страху перад ёй. Яе чакалі з поўным спакоем».

Арсеній Грышын выдрапаў на дошцы прозвішчы ўсіх, хто сядзеў у камеры. Насупраць Кавалёва і Нікіфарава пазначыў дату выбыцця. Раніцай яго самога выклікалі з рэчамі на выхад...

«Ён увесь час быў упэўнены, што яго чакае яшчэ не адзін допыт, таму гэта здзівіла як яго, так і нас, — расказвае Георгій Сапун. — Усхваляваны, ён пачаў развітвацца з намі і раздаваць сваю «маёмасць». Не ведаючы, каму даць персанальна, бо мелі патрэбу многія, ён зняў сваё аўчыннае футра і паклаў на падлогу, мяркуючы, відавочна, што яго вызваляюць. Але мы параілі яму пакінуць футра ў сябе, бо невядома, куды выклікаюць. Дамовіліся, што ў выпадку вызвалення ён пры першай жа магчымасці перадасць яго нам».

Але на другі дзень пасля сыходу Грышына перадачу перадалі не ад яго, а яму. Падпольшчыкі яе не ўзялі, хоць, вядома, мелі ў гэтым патрэбу: так яны хацелі паведаміць родным, што Грышына тут ужо няма...

* * *

У пачатку студзеня 1943 года з камеры нумар 13 адзін за адным выбыла шэсць чалавек. Двое (Нікіфараў і Кавалёў) былі выкліканы ў СД. Грышын — невядома куды. Трое захварэлі на тыф. Астатніх, у тым ліку аўтара гэтых каштоўных успамінаў, чакаў Асвенцім...

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

# ПРАБЛЕМА Ў ФІНАНСАХ І АДНОСІНАХ

## У Магілёўскай вобласці абмеркавалі крокі стварэння музея Алеся Адамовіча ў Глушы

**Размова адбылася ў рамках круглага стала, прысвечанага пытанням музеефікацыі літаратурных мясцін. Яго ініцыятарам стаў Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры. Менавіта ён, згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры, які сёлета 3 лютага ўступіў у дзеянне, з'яўляецца каардынацыйна-метадычным цэнтрам для музеяў падобнага кшталту. У размове прынялі ўдзел музейныя супрацоўнікі, вучоныя, гісторыкі, прадстаўнікі ўлады Магілёўскага аблвыканкама і Бабруйскага райвыканкама.**

### Музей не дасць вёсцы згінуць

Сёння лёс літаратурных музеяў наогул вымушае жадаць лепшага, і тут нешта трэба мяняць. Гэта думка стала лейтматывам сустрэчы. На развіццё і іх папулярызацыю не хапае грошай, і трымаюцца яны больш на энтузіязме тых, хто там працуе. Нашы пісьменнікі часцей за ўсё сельскага паходжання, і гэта таксама для ахвотных дабрацца да іх малой радзімы часам праблема. Дастаткова ўспомніць музей Максіма Гарэцкага ў Малой Багацькаўцы Мсціслаўскага раёна, што за 26 кіламетраў ад райцэнтра. Асноўныя яго наведвальнікі — навучэнцы вучэбных устаноў раёна. Іншых турыстаў амаль няма. Нехта сказаў: трэба перанесці. Раённыя ўлады прапанавалі насельніцтву выказаць свае думкі наконт гэтага і вызначыцца з пераносам. Меркаванні падзяліліся, але вырашана было пакінуць усё як ёсць. І гэта вельмі ўзрадавала спецыялістаў. Бо сэнс не толькі ў той хаце, дзе змешчана экспазіцыя. Каштоўна менавіта тое асяроддзе, дзе рос будучы пісьменнік. Магілкі яго продкаў.

— Такія музеі — геаграфія нашай культуры, — з горыччу кажа **старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір ГІЛЕП.** — Адмаўляючыся ад іх, мы знішчаем культурную прастору, беларускую культурную геаграфію, абядняем сябе і сваю зямлю. У нас на краіну каля 40 літаратурных музеяў, у той час як у маленькай Грузіі — 120. Вось як яны клапоцяцца пра сваю нацыю, пра сябе, пра свае прозвішчы.

Уладзімір Гілеп звяртае ўвагу на тое, што сёння, калі ідзе працэс знікнення маленькіх вёсак, такія музеі могуць запаволіць гэты працэс. «У маштабах вёскі, раёна абавязкова знойдуцца роды, вартыя ўшанавання, — адзначае ён. — Захаванне іх памяці дасць падставу зарадзіць у моладзі пачуццё павагі да сваіх продкаў. Гэтага нам сёння так не хапае. Адсутнасць гонару за сябе, сям'ю прыводзіць да абыякавасці.


Удзельнікі круглага стала.

### Узяць на сябе адказнасць

Пасёлак Глуша — малая радзіма Алеся Адамовіча. Ён таксама не побач з Бабруйскам, туды трэба ехаць. Але дзе, як не ў Глушы, можна будзе адчуць гэтага пісьменніка? Ён, па сутнасці, гісторыя пасёлка. Тут жылі і пахаваны яго продкі. Тут прайшло яго партызанскае ваеннае дзяцінства. Сюды ён прыязджаў у асабліва цяжкія часіны свайго жыцця, каб аднавіць свае сілы і зноў жыць. Тут па апошнім яго слове ён і пахаваны. Музей проста павінен быць тут. І не толькі прысвечаны памяці Алеся, а ўсяго яго роду, лічыць Уладзімір Гілеп.

Асаблівасць музея Алеся Адамовіча ў тым, што ён ствараецца на сродкі ад дабрачыннасці, а рахунак пры аддзеле ідэалогіі, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама папаўняецца вельмі марудна. На сёння сабрана сума на стварэнне праектна-каштарыснай дакументацыі, але гэта толькі маленькая частка ад таго, што трэба для адкрыцця музея. І гэта прымушае крыху хвалявацца адказных асоб. Бо дзе гарантыя, што патрэбная сума наогул сабярэцца?

— Для таго каб музей функцыянаваў, неабходна выканаць цэлы шэраг крокаў, — адзначае Дзмітрый Яцкевіч. — Праектна-каштарысная дакументацыя для таго і робіцца, каб увесці будынак у нармальную эксплуатацыю, каб захаваць яго. Зацікаўленасць у стварэнні музея ў мясцовых улад ёсць, падтрымка аблвыканкама таксама. Намеснік старшыні аблвыканкама Андрэй Кунцэвіч згодны з тым, што сабраныя грошы павінны пайсці на распрацоўку праектнай дакументацыі. Разам з прадстаўнікамі раённай улады і дачкой пісьменніка Наталляй Адамовіч мы паглядзелі аб'ект. Былі агавораны першыя крокі, якія дапамогуць гэту зварухнуць справу з мёртвага пункта. Падрыхтавана Палажэнне аб апякунскай радзе, знойдзена паразуменне па складзе групы гэтай рады. Пара пачынаць працаваць.

— Я разумею ўсю рызыку, звязаную з фінансаваннем. Але пакуль мы не накіруем грошы на каштарысна-праектную дакументацыю і не атрымаем заключэнне дзяржэкспертызы, нам болей ніхто ніякіх грошай не дасць, — падкрэслівае **старшыня Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон АСТАПОВІЧ.** — З дакументамі на руках можна будзе выходзіць да дазволу на работы і на міжнародныя гранты. А тое, што музей будзе запатрабаваны, можна не сумнявацца. Глуша стаіць на досыць бойкай трасе Р-43, старой варшаўцы. Там перспектыўны турыстычны маршрут, вакол ёсць помнікі, цікавыя мясціны.

**Намеснік начальніка аддзела галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Яўген БЕЛАВУСАЎ** адзначыў, што абласны выканаўчы камітэт зацікаўлены ў тым, каб гэты музей быў.

— Дзяржаўная палітыка краіны накіравана на падтрыманне малых населеных пунктаў, а музей — менавіта той аб'ект, які можа прыцягнуць дадатковую цікавасць да гэтага месца, — паведаміў ён. — Аблвыканкам будзе падтрымліваць Бабруйскі райвыканкам у прасоўванні дадзенай тэмы.

### Па дарозе ў Глушу

Сёлета спаўняецца 90 гадоў са дня нараджэння Алеся Адамовіча, і гэта самы лепшая нагода звярнуць увагу на асобу пісьменніка. Нагадаць пра яго літаратурную спадчыну і вялікі ўклад у захаванне памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны. Дастаткова згадаць жахлівую «акцыю застрашвання» і знішчэнне гітлераўцамі амаль 2 тысяч мірных жыхароў у вёсцы Баркі на тэрыторыі Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. Гэта жудасная падзея знайшла адлюстраванне ў аповесці Алеся Адамовіча «Карнікі», якая разам з яшчэ адным творам пісьменніка — «Хатынскай аповесцю» — стала асновай для аднаго з самых жорсткіх па сваёй праўдзівасці фільмаў XX стагоддзя «Ідзі і глядзі». У 2008 годзе на месцы трагедыі ў Барках быў узведзены мемарыяльны комплекс «Памяці спаленых вёсак Магілёўскай вобласці». І гэты аб'ект таксама мог бы стаць адным з пунктаў турыстычнага маршруту па дарозе ў Глушу.

— Музей гэты абавязкова будзе, але трэба, каб усе былі зацікаўлены ў рашэнні праблемы, — кажа Дзмітрый Яцкевіч. — Было б добра правесці дабрачынны марафон з удзелам райвыканкама і аблвыканкама ў падтрымку музея і падключыць да гэтага ўсе СМІ. У сувязі з 90-годдзем пісьменніка гэта была б самая адчувальная і так цяпер патрэбная дапамога па ўвекавечванні яго памяці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

Нагадваем, што дабрачынны рахунак для збору сродкаў на рэканструкцыю будынка пад музей Алеся Адамовіча адкрыты пры **аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама:**

**р/р 3642129272326 у філіяле 703 ААТ СБ «Беларусбанк», код 760 г. Бабруйск, УНП 701226324. Прызначэнне плацяжу «Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча». Увага! Падача назначэння плацяжу прынцыповая! Гэты доўгі сказ абавязкова павінен быць пазначаны на банкаўскім дакуменце.**

■ 50+: жыць цікава

# АД ЧАГО ДУША РАДУЕЦЦА

## Удзельніца фестывальных «гарадоў майстроў» пра сакрэты аптымізму і маладосці

**Алене Васілеўне ніхто яе ўзрост не дае. Заўсёды дагледжаная вясковая жанчына, якая займаецца агародам і гаспадаркай, мае даўняе хобі, выглядае... ну як наваспечаная пенсіянерка. Але сама яна ўзрост не хавае.**

— Нарадзілася я ў 1944 годзе, яшчэ да вызвалення, — расказвае Алена Капліч. — Немцы ў вёсцы стаялі. На святкаванне хрэсьбін прыйшлі некалькі салдат, падпілі і так нованароджаную пад столь падкідвалі, што бацькі апасаліся, каб не забілі дзіця... А потым гэтыя немцы, ну, можа, не гэтыя, іншыя, з карнага атрада хату нашу спалілі. Тады многа яны спалілі дамоў пры адступленні. Партызаны ў нашых краях дзейнічалі. Вось нагараваліся мае бацькі. Жыць даводзілася ў розных сваякоў, пакуль адбудаваліся.

Працаваць у полі, дапамагаць маці дзяўчынцы прыйшлося змалку. Ну і потым, колькі сябе помніць, усё жыццё працавала. З мужам дзяцей гадавалі, сваю вялікую гаспадарку трымалі, і на асноўнай рабоце яна ў адстаючых ніколі не хадзіла. Шмат гадоў адпрацавала Алена Васілеўна ў вясковым магазіне. За той перыяд мае медаль «За працоўную доблесць» і знак «Выдатнік савецкага гандлю». І вышываць любіла з маладых гадоў, але па-сапраўднаму занялася любімай справай, калі выйшла на пенсію.



Гасцёўня дома гаспадыні з Лутаўня нагадвае невялікі этнаграфічны музей. Сталы, крэслы аздоблены вышыванкамі, сурвэткі, ручнікі, абрусы, падушкі — усё расквечана іголкай. «Вось гэтую падушку, — паказвае Алена Васілеўна, — я вышывала гадоў сорак таму. А вось апошнія, вясельныя, ручнікі». Потым дадае, што на вясельным ручніку трэба вышываць не кветкі, а ягады, напрыклад рабіны, каліны, як сімвал урадлівасці. Так прабабулі рабілі.

У апошнія гады Алена Капліч захапілася ткацтвам. Станкі ў доме захаваліся, вось і тчэ сама палотны на ручнікі, а потым вышывае іх альбо аздабляе плеценымі карункамі.

— Калі ж вы ўсё паспяваеце? — агледзеўшы творы вясковай майстрыхі, не ўтрымліваюся ад банальнага пытання.

— Так, агарод у мяне вялікі, свіней, курэй трымаем. Муж хварэе, на жаль, дапамагчы па гаспадарцы не можа, сама спраўляюся, — расказвае жанчына. — Дзень мой пачынаецца ў пяць гадзін. З пяці да васьмі працую на агародзе. А потым прыйду і гадзіны дзве праводжу за вышыўкай. Тым самым нібы святкую пачатак дня. Ведаеце, гэта для мяне асалода — шыю, і душа радуецца. Каб магла, здаецца, есці б не варыла, не прыбірала ў хаце, а ўсё вышывала б... Так некалькі разоў на дзень выкройваю гадзінку на любімую справу. І дзень хутка праходзіць. Зімой, вядома, больш часу.



— А як удаецца трымаць сябе ў такой добрай форме?

— Не ведаю, усё хуценька, усё бягом, час за мной не паспявае, — смяецца суразмоўніца. — А калі сур'ёзна, нядаўна чытала, што ў таго, хто рэгулярна вышывае крыжыкам, зрок паляпшаецца, увесь час вока трэніруецца: уверх — уніз. Зноў жа, кажуць, вышыўка нервы супакойвае.

А Ніна Кіслюк, мастацкі кіраўнік Сінкевіцкага дома культуры, гаворыць, што Алена Васілеўна па натуры вялікі аптыміст. І ў яе, як ва ўсялякага чалавека, бываюць розныя сітуацыі. Але яна ўмее, як раяць псіхолагі, выцягваць сябе з любой непрыемнасці, не дазваляе сабе ўпадаць у роспач. І ўсё ў яе атрымліваецца. Можа, таму яе творы падабаюцца людзям, што яны знутры напоўненыя аптымізмам.

Майстрыху з Лунінеччыны Алену Капліч пастаянна запрашаюць на розныя фестывалі. «У 2009 годзе была на рэспубліканскіх дажынках у Кобрыне, — пералічвае вышывальшчыца. — Летась «Вясновы вянок» у Мінску, фестываль «Бездзежскі фартушок», зусім нядаўна — «Ружанская брама», а на Дзень Незалежнасці ў Брэсце прэзентавалі наш фэст «Лунінецкія клубніцы». Клубніцы для Лунінца — асаблівая тэма. Таму сурвэтак, ручнікоў з брэндавай ягадай яна вышывае многа, для падарункаў і сувеніраў. У Алены Васілеўны цэлая сцяна занятая дыпломамі за ўдзел у розных фестывалях. Ёсць адзнакі і свайго Лунінецкага райвыканкама. Тут яна нязменны ўдзельнік усіх свят.

— Во і цяпер на «Ружанскай браме» нейкі мужчына падышоў да выставы і засумняваўся: «Хіба гэта вышыванка ручной работы? Гэта ж фабрычная вышыўка». Яго змагла пераканаць у адваротным толькі ўласная жонка, калі ўважліва разгледзела работу.

Сапраўды, некаторыя арнаменты так скрупулёзна вышытыя, а галоўнае — на адваротным баку не пакінута ніводнага вузельчыка, што іх можна прыняць за машынную вышыўку. Але машынай майстрыха нават не падрублівае край ручніка альбо сурвэткі — усё робіць уручную.

Аказваецца, галоўны крытык, дарадца і памочнік нашай гераіні ў яе любімай справе — муж Аляксей Фаміч. Не раз пасля яго прагляду жонка мяняла тон альбо нават колер нітак, перарабляла наноў і ўпэўнівалася, што атрымалася сапраўды лепей. Так было нядаўна, калі аздабляла ручнік з сінімі кветкамі, а беражок зрабіла крыху іншага адцення. Муж падышоў і забракаваў. Перарабіла і ўбачыла, што выйшла прыгажэй.

У Алены Капліч уся сям'я творчая. Сын, які жыве і працуе ў Мікашэвічах, захапляецца разьбой па дрэве, вырабляе сувеніры з паперы. Яго дачка нядаўна зацікавілася вышываннем. А вось унучка (дачка Капліча ў жыве ў Маскве) бабуліна хобі не падзяляе. Яна займаецца вывучэннем замежных моў, дзіця інфармацыйных тэхналогій і вялікага горада. Але штогод праводзячы частку канікул у Лутаўні, унукі з'язджаюць з вышытымі сувенірамі. А бабулі і ў радасць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*
*Лунінецкі раён*


БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:

Республика Беларусь, 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2017 года**

**Наименование банка ОАО «Банк БелВЭБ»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | На 01.07.2017 | На 01.01.2017 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 73 470 | 72 406 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 515 | 550 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 122 618 | 163 995 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 155 068 | 228 346 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 805 229 | 897 594 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 2 616 229 | 2 391 934 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 12 408 | 10 047 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 193 219 | 203 296 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 708 | 708 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | 5 | 5 |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 22 657 | 30 955 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 4 002 126 | 3 999 836 |
| 15 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 9 117 | 12 739 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 1 431 562 | 1 582 271 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 2 038 868 | 1 901 237 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 9 275 | 3 352 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 31 066 | 33 282 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 3 519 888 | 3 532 881 |
| 24 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 117 408 | 117 408 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 53 876 | 53 876 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 79 905 | 80 091 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 231 049 | 215 580 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 482 238 | 466 955 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 4 002 126 | 3 999 836 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 6 месяцев 2017 года**

**Наименование банка ОАО «Банк БелВЭБ»**

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | За 6 месяцев 2017 года | За 6 месяцев 2016 года |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 178 796 | 208 132 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 91 783 | 106 599 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 87 013 | 101 533 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 43 261 | 43 993 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 13 921 | 13 342 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 29 340 | 30 651 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 53 | 643 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 778 | 28 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 7 847 | 9 860 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (190) | 11 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 25 166 | 51 141 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 4 401 | 4 859 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 70 625 | 64 071 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 3 741 | 3 062 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 29 710 | 29 311 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 4 785 | 2 891 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 24 925 | 26 420 |

**Председатель Правления** **Н. В. Лузгин**

**Главный бухгалтер** **Л. А. Филиппова**

**Дата подписания: 4 июня 2017 года**

Бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте **www.bveb.by** в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность за 2017 год, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь».

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 №6. УНП 100010078